# КАРЛОВІЧ ЯН



Польскі лінгвіст, этнограф, фальклярыст, музыказнавец. Акадэмік Акадэміі ведаў у Кракаве (1887, член-карэспандэнт з 1877). Нарадзіўся 28 мая 1836 г. ў в. Субартоніс Варэнскага раёна, Літва. Скончыў Маскоўскі ўніверсітэт (1857). Вучыўся ў Парыжы і Гейдэльбергу (1857-59), у Брусельскай кансерваторыі (1859-60). У 1871-82 гг. жыў і працаваў на Беларусі ў маёнтках Падзітва (Воранаўскі раён) і Вішнева (Смаргонскі раён). З 1882 г. жыў у Гейдэльбургу, Дрэздэне, Празе, з 1887 г. ў Варшаве. З 1868 г. збіраў і запісваў беларускія народныя казкі і іншыя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Распрацаваў "Дапаможнік для збіральнікаў народных твораў" (1871). Змясціў у перакладзе на польскую мову больш за 80 беларускіх легенд, паданняў і казак, якія запісаў у Вянцянскім, Лідскім і Навагрудскім паветах. У 1889 і 1891 гг. запісаў больш за 500 мелодый беларускіх народных песень. Заснавальнік (1887) і рэдактар (1888-99) часопіса "Вісла", у якім друкаваў беларускі фальклорна-этнаграфічны матэрыял. Памёр 14 чэрвеня 1903 года.

**Бібліяграфія:**


1. Карасиньская, И. Ян и Мечислав Карловичи и их роль в развитии русско-польских связей / И. Карасиньская // Русско-польские музыкальные связи. – Москва, 1997.
2. Карловіч Ян // Бандарчык, В.К. Гіторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. / В.К. Бандарчык. - Мінск, 1964. – С. 262-264.
3. Карлович Ян // Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX-XX вв). – Минск, 1997.
4. Карловіч Ян // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш.; маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 106.
5. Карловіч Ян // Пачынальнікі: з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. – Мінск, 1977.
6. Карловіч Ян // Саламевіч, Я. Міхал Федароўскі / Я. Саламевіч // Мінск, 1972. - С. 213.
7. Кісялёў, Г. Францішак Багушэвіч і Ян Карловіч / Г. Кісялёў // Кісялёў, Г. З думкай пра Беларусь. – Мінск, 1966.
8. Ліцьвінка, В. Важкі ўклад бацькі і сына ў беларускую этнамузыкалогію: з нагоды 170-годдзя Яна Карловіча / Васіль Ліцьвінка // Наша слова. – 2006. – 24 траўня. – С. 1-2.
9. Саламевіч, І.У. Карловіч Ян Аляксандр / І.У.Саламевіч // Беларускі

фальклор: энцыклапедыя: У 2 т. Т.1.: Акапэла – Куцця / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2005. – С. 659-661.
10. Саламевіч, Я. Карловіч Ян Аляксандр / Янка Саламевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 4. Кадэты – Ляшчэня / рэд. кал.: Г.П.Пашкоў і інш.; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1997. – С.116-117.
11. Саламевіч, І.У. Карловіч Ян / І.У.Саламевіч // Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 5. – Мінск, 1998. - С. 231.
12. Ян Карловіч у Падзітве // Карлюкевіч А. І вечны толькі край… / А. Карлюкевіч / Мінск, 2000. – С.60-63.